**Мацієўскі, М**. І сняцца салдатам трывожныя сны… / М. Мацієўскі // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1994. — 5 ліп. — С. 2.

## І СНЯЦЦА САЛДАТАМ ТРЫВОЖНЫЯ СНЫ…

Яму часта сняцца сны, то раптам дзяцінства ўспыхне ў ззянні блакітных азёр, то школьныя гады зазвіняць вясёлым шчэбетам, то ён сярод сяброў-механізатараў – прыгожых, моцных хлопцаў... Але часцей за ўсё яму сніцца Афганістан. Мо, памяць спакою не дае, а мо і праўду кажуць, што самыя цяжкія мінуты жыцця назаўсёды западаюць у душу, як зярняты. А затым, быццам прарастаючы, напамінаюць аб сабе.

Анатоль доўга не мог прачнуцца. Ускрыкнуўшы нягучна, штосьці шаптаў засмяглымі вуснамі. Раскрыў вочы, калі адчуў цеплыя далоні жонкі.

...З многімі «афганцамі» даводзілася сустракацца – разгаворлівымі і маўклівымі, волатамі і непрыкметнага выгляду. Але яны – хто сам, хто з «падказкай» гаварылі, што цяпер іх жыццё мае тры дакладна раздзеленыя паласы – да Афганістана, сам Афганістан і пасля яго. Вядома, раздзелены яны ўмоўна, паколькі сувязі тут, калі ўдумацца, больш адчувальныя, чым адрозненні. І ўсё ж...

Анатоль Дзярагін не быў апошнім вучнем у школе. Займаўся спортам. Затым атрымаў прафесію шафера. Працаваў у родным калгасе імя Чапаева.

Вельмі абрадаваўся, атрымаўшы позву ў армію. Ды і Узброеныя Сілы набылі ўпаўне сталага чалавека – прывычнага да працы, фізічна загартаванага, з характарам, добрымі ведамі.

Што яшчэ сказаць аб ім, тагачасным? Хлопец быў як хлопец – не любіў ад кагосьці залежыць, умеў пастаяць за сябе, цаніў таварыскасць і пастаянства ў чалавечых адносінах. «Мамачка, не хвалюйся! Служба ідзе нармальна. Здаровы. Хлопцы ў нас ва ўзводзе проста выдатныя. Ахоўваем паўднёвыя рубяжы нашай краіны. Не хвалюйся! Я ж салдат, мама...»

Так пісаў кожны раз Анатоль Дзярагін у пісьмах да маці. Не хацеў трывожыць яе, не пісаў, што служыць у Афганістане.

– Сэрца ў яе вельмі мяккае, чулае, – гэта ўжо сення гаворыць былы воін-інтэрнацыяналіст. – Ды такое, пэўна, у кожнай маці. Не хацелася, каб яна плакала, начэй не спала.

Па просьбе афганскіх таварышаў у адзін з горных кішлакоў, адрэзаных ад правінцыі бандай, тэрмінова трэба было даставіць прадукты і медыкаменты. Выбар трапіў на некалькіх байцоў з узвода, у якім служыў Анатоль. Верылі: не падвядуць хлопцы, выканаюць заданне.

На бронетранспарцёры група накіравалася ў горы, туды, дзе галадалі мірныя людзі. Усё ішло добра, здавалася, абыйдзецца без сустрэчы з душманамі.

І раптам каля «зялёнкі», дзе дарога крута зварочвала налева ад скалы, узарвалася міна... Другая адарвала кола бронетранспарцёра, вывела са строю радыёстанцыю. Следам прагрымеў гранатамёт...

– Да бою!

Імгненна пакінуўшы бронетранспарцёр, воіны ўступілі ў схватку з душманамі. Каля вялікага валуна зручную пазіцыю заняў Анатоль Дзярагін, ведучы прыцэльны агонь.

Бой на гэты раз быў нядоўгі. Бандыты адступілі ў горы. Але як быць з бронетранспарцёрам, які загружан правіянтам, але выйшаў са строю. Рашэнне прыйшло само сабой: муку, цукар, медыкаменты на плячах даставіць горцам!

І вось яны, апошнія крокі!... Сэрцы радасна забіліся, калі ўбачылі хлапчукоў, якія беглі насустрач, а за імі некалькі старых .Гэта добры знак: значыць душманы пакінулі кішлак.

Перакладчык не паспяваў за хуткім афганскім говарам. Але салдаты зразумілі яго амаль без перакладу. «Ташкор, аскеры!», «Дзякуй, салдаты». Гэты выраз часцей за ўсё злятаў з абветраных вуснаў дэхкан.

Колькі такіх аперацый было ў Анатоля Дзярагіна! Хіба забудзецца той бой, калі трымалі кругавую аброну каля кішлака? Задача была з няпростых: не дапусціць душманаў да крыніцы, якая паіла і дэхкан, і вінаграднікі. І хоць сілы былі няроўнымі, не адступілі, адбілі водакрыніцу. А бронежылеты знялі толькі тады, калі падаспелі верталёты, адкінуўшыя рэшткі банды ў горы.

Шмат разоў хадзіў Анатоль на баявыя заданні. І ні разу, не змаладушнічаў – паступаў так, як таго патрабавала абстаноўка. Аб гэтым сведчаць баявыя ўзнагароды. А яшчэ служба ўсяляла ў яго веру ва ўласныя маральныя і фізічныя сілы. Загартаваны ў баях, ён стаў лепш разумець жыццё.

**М. Маціеўскі**